МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

29.08.2012 № 141

г. Мінск

г. Минск

Аб экспертным савеце па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў

У адпаведнасці з пунктам 20 Палажэння аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 чэрвеня 2006 г. № 730

ЗАГАДВАЮ:

1. Стварыць пры дзяржаўнай установе "Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь" экспертны савет па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў.

2. Зацвердзіць прыкладзеныя:

Палажэнне аб экспертным савеце па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў;

склад экспертнага савета па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў.

Першы намеснік Міністра У.М.Карачэўскі

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Аддзел кантролю і справаводства Для дакументаў

З. 2044.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
29.08.2012 № 141

ПАЛАЖЭННЕ
аб экспертным савеце па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў

1. Экспертны савет па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў (далей – экспертны савет) ствараецца пры дзяржаўнай установе "Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь" для ўзгаднення пераліку музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь (далей – музейных прадметаў), за выключэннем тых, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, якія адносяцца да асабліва каштоўных музейных прадметаў і падлягаюць рэгістрацыі ў Дзяржаўным каталогу Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.

2. У сваёй дзейнасці экспертны савет кіруецца нарматыўнымі прававымі актамі Рэспублікі Беларусь і сапраўдным Палажэннем.

3. У склад экспертнага савета ўваходзяць прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных музеяў, іншых арганізацый. Экспертны савет узначальвае старшыня, а ў яго адсутнасць – намеснік старшыні экспертнага савета.

Колькасны і персанальны склад экспертнага савета зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры.

4. Арганізацыйныя пытанні работы экспертнага савета забяспечваюцца дзяржаўнай установай "Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь".

5. Для прыняцця рашэння аб узгадненні рашэння музея або юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленнем якой з'яўляецца музей, аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў музей або юрыдычная асоба, структурным падраздзяленнем якой з'яўляецца музей, прадстаўляюць ў экспертны савет:

хадайніцтва аб узгадненні рашэння аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў;

праект загада музея або юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленнем якой з'яўляецца музей, аб аднясенні музейных прадметаў

да асабліва каштоўных музейных прадметаў па форме згодна з дадаткам да дадзенага Палажэння;

выпіску з пратаколу пасяджэння фондава-закупачнай камісіі або іншай упаўнаважанай кіраўніком музея або юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленнем якой з'яўляецца музей, камісіі.

6. Экспертны савет у межах сваёй кампетэнцыі:

разглядае і ўзгадняе рашэнні музеяў або юрыдычных асоб, структурнымі падраздзяленнямі якіх з'яўляюцца музеі, аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў;

адмаўляе ва ўзгадненіі рашэння музеяў або юрыдычных асоб, структурнымі падраздзяленнямі якіх з'яўляюцца музеі, аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў у выпадку адсутнасці або страты імі сваёй навуковай, гістарычнай, мемарыяльнай, мастацкай і (або) эстэтычнай вартасці;

кансульціруе музеі па пытаннях аднясення музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў.

7. Пасяджэнні экспертнага савета праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў квартал.

Пасяджэнні экспертнага савета лічацца правамоцнымі пры наяўнасці не менш 2/3 яго складу. Рашэнні экспертнага савета сапраўдныя, калі яны прыняты большасцю галасоў членаў экспертнага савета, якія прысутнічалі на яго пасяджэнні.

Рашэнні экспертнага савета фіксуюцца ў пратаколе. Пратаколы пасяджэння экспертнага савета складаюцца ў адным экзэмпляры і падпісваюцца ўсімі прысутнымі на дадзеным пасяджэнні членамі экспертнага савета.

Дадатак
да Палажэння аб экспертным савеце па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў

Форма

______________________________________________
(назва арганізацыі)

ЗАГАД

______________№____ ____________

Аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў

У адпаведнасці з пунктам 20 Палажэння аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 чэрвеня 2006 г. № 730, на падставе пратакола пасяджэння______________________________________
(указваецца найменне камісіі і музея)
________________ № ____

ЗАГАДВАЮ:

Аднесці наступныя музейныя прадметы*, якія захоўваюцца ў музейным фондзе________________________________________
______________________________________________,
(назва музея)
да асабліва каштоўных музейных прадметаў:

1.______________________________________________;
(указваецца ўліковае абазначэнне музейнага прадмета, яго прадметнае імя і назва, аўтар, час і месца стварэння, матэрыял, тэхніка)

______________

*Пры наяўнасці значнай колькасці музейных прадметаў магчыма іх пералік указваць у дадатку да загаду.

2.______________________________________________________________;
3.______________________________________________________________.
4.______________________________________________________________.
5.______________________________________________________________.

Кіраўнік музея (арганізацыі, структурным падраздзяленнем якой з'яўляецца музей)

________________ ________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

УЗГОДНЕНА
Пратакол пасяджэння экспертнага савета па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў
___.___.20___ № ___